Письменное задание первого этапа квалификационного экзамена при прохождении аттестации педагогическими работниками на присвоение высшей квалификационной категории

Дата экзамена_____

Прозвішча, імя, імя па бацьку

_____

Месца працы_____

_____

пасада _____

Інварыянтная частка

1. Па міжнароднай праграме PISA праводзяцца даследаванні па прыродазнаўчанавуковай, матэматычнай і чытацкай граматнасці. Што разумеюць арганізатары даследаванняў пад чытацкай граматнасцю?

_____

_____

_____

_____

_____

_____.

2. Пералічыце асноўныя адрозніванні сачынення-разважання ад эсэ._____

_____

_____

_____

_____

_____

_____.

3. Што вы разумееце пад маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыяй?

_____

_____

_____

_____

_____

_____

_____.

4. Асноўныя прынцыпы адбору зместу навучання беларускай мове: сістэмна-функцыянальны прынцып, прынцып мінімізацыі моўнага і маўленчага матэрыялу і г.д. Дайце азначэнне паняццю камунікатыўна-рытарычны

прынцып - гэта

_____
_____
_____
_____
_____
_____.

5. Раскрыйце аб’ём паняцця “вучэбна-метадычны комплекс” па мове_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____.

6. Дайце паняцце азначэнню “рэфлексія” – гэта
_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____.

7. Пералічыце асноўныя структурныя кампаненты дапрофільнай падрыхтоўкі:_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____.

8. Што азначае рэалізацыя прынцыпу дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання?_____
_____
_____
_____
_____

_____
_____
_____.

9. Дапоўніце азначэнне правільным адказам:

Выхаванне – гэта _____ агульначалавечых каштоўнасцей асабы ў адпаведнасці з патрабаваннямі грамадства на дадзеным этапе яго развіцця.

а) мэтанакіраваная дзейнасць па фарміраванні;
б) мэтанакіраваны працэс фарміравання;
в) мэтанакіраваны цыкл па фарміраванні;
г) забеспячэнне ўмоў для фарміравання.

10. Дапоўніце выказванне: фактычныя памылкі ў сачыненні – гэта _____
_____
_____
_____
_____
_____
_____.

Варыятыўная частка

1. **Адзначце асноўны сродак сувязі сказаў у наступным тэксце:**

Максімальная колькасць балаў -1

Мінск, як і кожны город, мае свой характар, сваё непаўторнае аблічча. Прайдзіцеся на світанні па праспекце Незалежнасці, калі вуліцы і паркі заліты мяккім ружаватым святлом, а далёкія краявіды плывуць у ранішняй смузе. Прайдзіцеся надвячоркам па вуліцах, калі горад становіцца блакітным і запальвае агні._____
_____.

2. **Адзначце нумары тэкстаў, у якіх сказы звязаны паміж сабой паслядоўнай сувяззю:**

Максімальная колькасць балаў -1

1) На дварэ ішоў дождж, асенні, дробны, але яшчэ цёплы, церушыў, як праз сіта. Суцэльная хмара, быццам нерухомая, вісела над зямлёй. Над ракой плакаліся вербы, ранялі долу першае лісце.
2) Берагі, як стрыечныя браты, чымсьці розняцца. Адзін – высокі, камяністы, парослы рэдкалессем, шорсткімі травамі. Другі – спадзісты.
3) Ліпа падала. І падала страшэнна марудна. Спачатку яна ўздрыганула, скаланулася ўсім голлем, нібы хацела атрэсці з лісця рэшткі ранішняй расы.

4) Вася ляжыць пад арэхавым кустом, палуднуе. Прыемнай стомай ные цела. Сонца паступова ідзе на схіл. Дзень вельмі гарачы.
5) Ноччу выпаў сняжок. Прыкметна пабялелі і без таго белыя бярозы. Выразней сталі глядзецца камлі сосен. А чорная вольха так і крэсліць неба сваімі галінамі.

3. Адзначце нумары сказаў, у якіх падкрэслены часціцы.

Максімальная колькасць балаў -3

(1) Снег ляжыць **на** зямлі агромністай асляпляльнай коўдрай, вісеў на галінах тоўстымі глыбамі небывалай формы. (2) **Як** ён толькі трымаўся!

(3) **Вось** на тонкай бярозавай галінцы ўладкаваўся снежны ком. (4) Ён нагадвае грыб баравік **з** вялізнай шапкай. (5) Галінка апусцілася **аж** да самага долу пад яго цяжарам. (6) **А** грыб сядзіць сабе, не падае. (7) **А** махнатая елка стала падобнай на святочнага Дзеда Мароза. (8) Дзед расставіў свае рукі-лапы, **быццам** збіраецца абняць імі ўвесь свет. (9) **Побач** з дзедам дзівосная пячора. (10) Рыма ведае: дакраналіся **толькі** да яе сякерай – і пячора ператвараецца ў звычайны куст арэшніку. (11) Але Рыма не дакранаецца – **няхай** будзе пячора.

4. Спачатку выпішыце прыметнікі, якія маюць кароткую форму, а затым прыметнікі – якія маюць усечаную(сцягнутую форму).

максімальная колькасць балаў -2,5

(1)Недзе далёка ў небе адыходзілі журавы; іх галасы былі ледзь чутны. (2) З плеч спадаюць яе косы, нібы сонца косы, і іскрацца, як на сонцы, брыльянцісты росы. (3) Дзякуй богу, здарова. За мяне не хвалюйся. (4) Беларусь! Як ты дорага мне, як нішто і ніколі ў жыцці. (5) Дзявочу красу, нібы тую расу, піў цагляны падвал цёмнай ночы.

кароткая форма:_____

_____

усечаная форма:_____

_____.

5. Запішыце і патлумачце, як у літаратуразнаўстве называецца такі верш.

Максімальная колькасць балаў -2,5

Яко цецярук у лесе балбоча,
Так мое сэрцэ –да цябе сакоча!
Ні верашчака, кілбаса, сялянка –
Ніц ні міло –без цябе, каханка!
Рве се мэ сэрцэ –як тая атоса,
Кеды торгаё пшэклентэ калёса!...

(“Плач пакінутага каханай”).

(Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі)

_____

_____

_____

_____

_____

_____

_____

_____.

6. **Вызначце фактычныя памылкі ў сказах. Зверху памылкова ўжытых слоў і словазлучэнняў запішыце правільныя лексічныя адзінкі або выкрасліце лішнія.**

Максімальная колькасць балаў -4

1. Да стылістычных фігур адносяцца анафара, эпіфара, метафара, градацыя, асіміляцыя, інверсія, антытэза, шматзлучнікавасць, шматпрыназоўнікавасць.
2. Найважнейшым сродкам ўзбагачэння слоўніка беларускай мовы, галоўным шляхам узнікнення тэрмінаў прынята лічыць словазмяненне і словаўжыванне.
3. Вышэйшым органам Саюза пісьменнікаў БССР з’яўляўся пленум пісьменнікаў БССР, на якім абмяркоўваліся важнейшыя праблемы літаратурнага жыцця рэспублікі.
4. Узорам трылогіі ў беларускай літаратуры з’яўляецца аповесць Алены Васілевіч “Пачакай, затрымайся…”, дзе асобныя часткі (“Расці, Ганька”, “Доля знойдзе цябе”, “Новы свет”, “Пачакай, затрымайся…”) складаюць сюжэтна завершаныя аповесці, звязаныя гісторыяй галоўнай .

7. **Выпішыце са сказаў перыфразы. Растлумачце іх значэнне. Укажыце сінтаксічную ролю. Адказ аформіце ў выглядзе табліцы.**

Максімальная колькасць балаў -5

Скажы мне, варажбітка баравая,
Мо чула дзе ці, можа, знаеш ты:
Калі да нас свабода завітае,
Калі з астрогаў вернуцца браты.

М.Танк

Хай раніца жыцця майго ўскрэсне,
Хай вечар мне жыцця ноч дапяе.

Я.Купала

Шумна прайшлі каля ўзлесся
Жніўныя тры караблі.

А.Астрэйка

Уся неабдымная імперыя дранцвела і дубела ад жахлівага палітычнага марозу.

У.Караткевіч

перыфраза	значэнне	сінтаксічная роля

8. **Адзначце правільныя сцверджанні:**

Максімальная колькасць балаў -2

1) Мнагазначныя марфемы ў межах адной часціны мовы маюць не адно, а некалькі значэнняў, напрыклад: **да**бегчы, **да**плаціць, **да**даць.
2) Назоўнікавы суфікс –**ств-(-цтв-)** ва ўсіх выпадках мае адно значэнне: хара**ств**о, сялян**ств**а, выдаве**цтв**а, мацярын**ств**а, дзяцін**ств**а.
3) Аманимичныя марфемы супадаюць у гучанні, але не маюць нічога агульнага ў значэнні, напрыклад: **мас**а і **мас**аж, **па**ехаць і **па**просту, танц**ав**аць і дзед**ав**а, добр**ы** і лясы.
4) Сінанімічныя марфемы маюць аднолькавае значэнне, а гучаць па-рознаму, напрыклад: вартаў**нік**, груз**чык**, твор**ц**а, трактар**ыст**.
5) Ананімічныя з'яўляюцца марфемы з супрацьлеглым значэннем: **уз**лезці– **з**лезці, **ува**йсці – **вы**йсці, **неда**выканаць– **пера**выканаць.

9. **Пры вызначэнні месца падзеі мы ўжываем варыянты <u>на Беларусі</u> і <u>ў Беларусі.</u>**

Абодвы яны адпавядаюцьлітаратурнай норме, але маюць розныя сэнсавыя адценні. Растлумачце і прывядзіце прыклады.

Максімальная колькасць балаў -1

_____

_____

_____

_____

_____

_____

_____
_____
_____
_____
_____
_____.

Старшыня камісіі _____Астапук А.І.
Сакратар камісіі_____Марчык М.У.